# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ГУЛЬНЯ «АДНО З ДВУХ»

## ДЛЯ ПРАВЕРКІ ЭРУДЫЦЫІ ВУЧНЯЎ НА ІІІ СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

**Ст. Р. Рачэўскі,**
дацэнт кафедры прафесійнага развіцця
работнікаў адукацыі Брэсцкага абласнога
інстытута развіцця адукацыі, кандыдат
філалагічных навук

Эрудыцыя (лац. *eryuditio* – вучонасць), як тлумачыцца ў разнастайных лексікаграфічных выданнях, – гэта начытанасць, веданне адной ці некалькіх навук у іх асновах, што сфарміраваліся пры вывучэнні і асэнсаванні розных інфармацыйных крыніц. Па сутнасці, эрудыцыя – вынік захавання ў памяці істотнага аб'ёму ведаў і звестак. Яна, як вядома, суіснуе з агульным развіццём асобы – развіццём інтэлектуальных і фізічных якасцей, здольнасцей, навыкаў, карысных у жыццёвых сітуацыях.

Сучасная школа – найлепшае асяроддзе для паступовага нарашчэння эрудыцыі і агульнага развіцця асобы. Гэтаму працэсу спрыяе ў першую чаргу асваенне зместу гуманітарных і прыродазнаўча-матэматычных дысцыплін, якія прадугледжаны адукацыйнымі стандартамі і вучэбнымі праграмамі. У сучаснай школе, асабліва на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі, калі зведаны асновы большасці вучэбных прадметаў і адбываецца абагульненне і сістэматызацыя ведаў, нямала сітуацый, калі неабходна ўстанавіць узровень эрудыцыі і шырэй – агульнага развіцця асобных вучняў ці асобных класаў. Трэба, напрыклад, выявіць, хто можа быць рэкамендаваны да даследчай працы і ўдзелу ў конкурсах вучнёўскіх даследаванняў рознага ўзроўню, або, напрыклад, трэба спрагназаваць, хто з навучэнцаў пры належнай падрыхтоўцы здольны прайсці этапы рэспубліканскай алімпіяды

школьнікаў па адным з прадметаў. У школе штогод плануюцца і праводзяцца разнастайныя інтэлектуальныя спаборніцтвы, і трэба вырашыць, хто прадставіць клас у адным з іх. Сёння магчымасці ўдзелу ў дзіцячых і юнацкіх конкурсных выпрабаваннях прапануюцца нацыянальным тэлебачаннем: на канале “Беларусь 1”, напрыклад, рэгулярна праводзіцца папулярная ў асяроддзі школьнікаў і іх педагогаў шоу-віктарына “Я знаю” для V–XI класаў, на канале “Беларусь-3” – тэлевіктарына “Сваімі словамі”, таксама для школьнікаў. А яшчэ на працягу кожнага навучальнага года ў нашай сістэме агульнай сярэдняй адукацыі – мноства разнапрофільных конкурсаў, у якіх суб’ектам школьнай адукацыі можна прадэманстраваць інтэлектуальнае і агульнае развіццё, і значыць: у школе неабходна ажыццявіць адбор удзельнікаў.

Для мэтанакіраванага і аб’ектыўнага адбору з вучнёўскіх радоў будучых канкурсантаў аўтарам артыкула распрацавана **інтэлектуальная гульня для старшакласнікаў “Адно з двух”**. Ёй нададзены тэставы характар, але тэставае апытванне праводзіцца вусна. Агульны ход гульні наступны:

1. Удзельнікі, а імі могуць быць усе ў класе, утвараюць шырокае кола, выстраіўшыся па перыметры памяшкання, уздоўж сцен.

2. Мадэратар гульні – настаўнік – па чарзе задае кожнаму ўдзельніку пытанне і прапануе 2 варыянты адказу, а правільны з іх адзін; на абдумванне выбару адводзіцца 10 секунд.

3. Той, хто выбраў правільны адказ, застаецца удзельнікам гульні; той, хто выбраў няправільны адказ (пра гэта на хаду паведамляе мадэратар), выбывае з саставу ўдзельнікаў і становіцца гледачом, што сочыць, як спраўляюцца з тэставымі заданнямі астатнія.

4. Мадэратар працягвае тэставае апытванне, і кола ўдзельнікаў паступова змыкаецца, звужваецца датуль, пакуль не застанецца адзін, які становіцца пераможцам. Мадэратар можа на тым спыніць гульню, а можа і далей апытваць лепшага ўдзельніка, каб упэўніцца, што ў яго лідарстве няма

выпадковасці, ці, напрыклад, каб убачыць, наколькі высокай з’яўляецца для лідара і тых, хто наблізіўся да яго, планка правільна выбраных адказаў.

Для правядзення гульні неабходна распрацаваць 100 – 150 тэставых заданняў па мадэлі “Адно з двух”, бо загадзя складана ўстанавіць, колькі, якія з іх і на якім этапе стануць для вучняў інтэлектуальнай перашкодай. У тэставыя заданні адбіраюцца пытанні не праблемныя, што патрабуюць затрат часу на абдумванне, а менавіта тыя, што ўтвараюць паняційна-тэрміналагічны ці не самы складаны фактуальны пласт атрыманых ведаў, начытанасці, інфармаванасці; у пытаннях трэба абыходзіць нацэленасць на глыбокія унутрыпрадметныя сувязі, што ўстанаўліваюцца, напрыклад, у экзаменацыйных умовах ці ў разгорнутых адказах на ўроках.

Пытанні толькі на першы погляд здаюцца лёгкімі: хутка назваць правільны адказ часам няпроста, бо, здараецца, супастаўляюцца аб’екты ці з’явы, блізкія па прыродзе або ўласцівасцях; дзе-нідзе ў адказах трэба прымяніць логіку, а гэта вымушае задумацца ці выклікае разгубленасць.

Адукацыйны сэнс тэставых заданняў па мадэлі “Адно з двух” – падвесці асобу ўдзельніка да грані ведання ці няведання: веданне стымулюе, бадзёрыць, няведанне – матывуе да кампенсацыі нязнанага, нацэльвае на павелічэнне аб’ёму начытанасці і рух наперад. За кожны правільны адказ налічваецца 1 бал. Калі са 100 тэставых заданняў ўдзельнік набірае ад 50 да 60 балаў, трэба лічыць, што ў яго добры ўзровень эрудыцыі, але які можа з часам павышацца; калі набіраецца ад 60 да 80 балаў, трэба лічыць, што ўдзельнік – уладальнік вельмі добрага ўзроўню эрудыцыі; калі ад 80 да 100 – высокага ўзроўню. Налічваць балы ўдзельнікам дапамагае яшчэ адзін педагог; калі ж такога памочніка няма, кожны з удзельнікаў запамінае сваю суму набраных балаў і пасля гульні паведамляе яе настаўніку.

Значэнне такіх, як “Адно з двух”, інтэлектуальных гульняў нельга, аднак, пераўвялічваць: яны набываюць свой сэнс толькі ў сукупнасці з іншымі спосабамі выяўлення вучнёўскай эрудыцыі. Адны настаўнікі, напрыклад, выбіраюць для дыягностыкі яшчэ і эсэ з неабмежаваным

аб’ёмам напісання, другія карыстаюцца спецыяльным тэсціраваннем з удзелам педагога-псіхолага, трэція абыходзяцца працяглымі назіраннямі за асобнымі вучнямі, наведваннем урокаў іншых настаўнікаў.

Інтэлектуальная гульня “Адно з двух” – выдатная магчымасць для настаўніка праверыць:

- наколькі хутка і якасна вядомае пераводзіцца вучнямі з памяці ў маўленне;
- як развіваюцца ў іх псіхічныя працэсы (успрымання, увагі, памяці і інш.), працэсы фіксацыі і перапрацоўкі атрыманай інфармацыі;
- як у складанай інтэлектуальнай сітуацыі “пружыняць” думка  і памяць; у каго самая хуткая рэакцыя;
- якім з’яўляецца ўзровень начытанасці асобных вучняў, карыстання сродкамі масавай інфармацыі;
- наколькі часта і прадуктыўна выкарыстоўваюцца ў  працэсе навучання іншымі настаўнікамі міжпрадметныя сувязі;
- наколькі ў класе цікавяцца рознымі галінамі ведаў, у каго інтарэсы зводзяцца толькі да адной з галін;
- каму пакуль што не хапае назіральнасці, рацыянальнага пазнання свету;
- наколькі і хто з вучняў  канкурэнтназдольны.

Лёгка заўважыць: на выбар аднаго з двух адказаў даецца мінімум часу. Гэта апраўдана, бо  якраз у такім храналагічным рэжыме і можна ўстанавіць трываласць ведаў,  закладзеных у памяць вучняў: лічбаў, фактаў, імёнаў, значэнняў, уласцівасцей і іншага, што сведчыць пра ўзровень інфармаванасці, агульнага развіцця. Дарэчы, у многіх пазашкольных конкурсных умовах згадаць патрэбнае належыць менавіта аператыўна, як гэта робяць, напрыклад, націскаючы кнопку, у тэлеконкурсах. Ды і ў дарослым жыцці, калі перавесці гаворку на прафесійную дзейнасць, многія рашэнні вытворчага характару даводзіцца, апіраючыся на веды і кампетэнтнасць, прымаць неадкладна. На гэтым шляху гульня “Адно з двух” – своеасаблівы трэнінг.

Карыстальнікам гульні як спосабу працы з суб’ектамі школьнай адукацыі спатрэбіцца наступны каркас тэставых заданняў; ён рухомы, бо можа змяняцца, скарачацца, дапаўняцца (усё залежыць ад адукацыйнай сітуацыі, патрэбы), але галоўнае – можа быць добрым індыкатарам наяўнай эрудыцыі вучняў:

1. Якое лёгкае большае ў чалавека: **правае** ці левае? (*тлустым шрыфтам тут і далей выдзелены правільны адказ*)
2. Кансіліум у медыцыне – гэта **нарада** ці канферэнцыя?
3. Багамол – гэта земнаводнае ці **насякомае**?
4. Полька – гэта танец па паходжанні польскі ці **чэшскі**?
5. Якая тканка самая цвёрдая ў арганізме чалавека; **зубная эмаль** ці вялікая бярцовая косць?
6. Дзе пазногці растуць марудней: на пальцах **ног** ці рук?
7. Ёсць у чалавека частка цела, што не мае кровазабеспячэння і атрымлівае кісларод з паветра: гэта **рагавіца вока** ці мочка вуха?
8. Пісьмо Таццяны Ларынай Анегіну пісалася на **французскай** ці на рускай мове?
9. Па-руску яичница, а па-беларуску _________?
10. Па-руску янтарь, а па-беларуску __________?
11. Дойлід – гэта будаўнік ці **архітэктар**?
12. Сталіца Туніса – **Туніс** ці Габес?
13. Дамаск – горад **сірыйскі** ці турэцкі?
14. Па Смаленску працякае Сож ці **Дняпро**?
15. Варонежская вобласць знаходзіцца **на поўдні** ці на ўсходзе ад Масквы?
16. Большая плошча ў **Бразіліі** ці ў Аргенціны?
17. Мексіканскі заліў знаходзіцца бліжэй да Гандураса ці да **Кубы**?
18. Па-беларуску закрый вароты ці **зачыні** ?
19. Па-беларуску пры Пятры ці **пры Пятру**?
20. Брат і сястра Касмадзем’янскія вучыліся ў адной са школ **Масквы** ці

Ленінграда?

21. Саратаў, дзе, як спяваецца, так “многа хлопцаў халастых” і “залатых агнёў”, – горад на **Волзе** ці на Вятлузе?

22. Арына Сабаленка – спартыўная зорка Беларусі ў **тэнісе** ці ў біятлоне?

23. Еўрапейская федэрацыя футбола – гэта **УЕФА** ці ФІФА?

24. У спіс матэрыяльных каштоўнасцей ЮНЕСКА ад Беларусі занесена **Белавежская пушча** ці Прыпяцкі запаведнік?

25. Крыж Еўфрасінні Полацкай упрыгожвае грашовую купюру **10 рублёў** ці 20 рублёў?

26. Берасцейскага старасту Чорнага часоў Вялікага Княства Літоўскага звалі **Мікалай Радзівіл** ці Уладзіслаў Радзівіл?

27. З якога матэрыялу выраблены арыгінал Венеры Мілоскай – з гіпсу ці з **мармуру**?

28. На якім паўвостраве знаходзіцца Балгарыя – на Пірэнейскім ці **Балканскім**?

29. Што трэба ведаць для вымярэння аб’ёма мяча – **чысло Пі** ці закон Джоуля Ленца?

30. На якой рэчцы адбылася дуэль Пушкіна з Дантэсам – на Белай ці **Чорнай**?

31. Як называецца група львоў, што жыве разам, – **прайд** ці зграя?

32. На чым ратуюцца героі карціны Айвазоўскага “Дзявяты вал”: на рэштках палубы ці **мачты**?

33. У якой краіне знаходзіцца Тадж-Махал – у Бразіліі ці **Індыі**?

34. Якія горы ёсць у Румыніі – **Карпаты** ці Альпы?

35. Маіс – гэта манка ці **кукуруза**?

36. Як называецца традыцыйная лодка на каналах Венецыі – каноэ ці **гандола**?

37. Якой жывёле дазволена знаходзіцца ў мячэці – кошцы ці **сабаку**?

38. “ У панскі двор дзеля красы яны, бяздольныя, узяты ткаць залатыя паясы…” – напісаў у вершы “Слуцкія ткачыхі” М. Багдановіч. Бяздольныя ў гэтым тэксце – няшчасныя ці **бяспраўныя**?

39. Беларуская актрыса Паліна Мядзёлка – яе праобраз лёг у аснову вядомай п’есы **Янкі Купалы** ці Якуба Коласа?

40. Красамоўнай і суровай песняй назваў верш Я. Купалы “А хто там ідзе?” **Максім Горкі** ці Мікалай Астроўскі?

41. Хто з беларускіх класікаў асабліва любіў Грузію і часта адпачываў там – Якуб Колас ці **Янка Купала**?

42. Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак бралі з сабой у космас кнігі П. Броўкі ці **Я.Купалы**?

43. Карта ментальная і карта памяці на ўроку – гэта **адно і тое ж** ці рознае?

44. Песня “Слуцкія ткачыхі” **ёсць** ці няма?

45. Фігура чырвонага зубра усталявана на мяжы Брэсцкай і Гродзенскай ці **Брэсцкай і Мінскай абласцей**?

46. Інсталяцыю складаюць з прадметаў аднародных ці **разнародных**?

47. Вершамі якога класіка зачытваўся Ю. Гагарын – **Я. Купалы** ці А. Куляшова?

48. Гексы на ўроках мовы і літаратуры – гэта фігуры пяцівугольныя ці **шасцівугольныя**?

49. <u>Збожжа</u> і <u>збажына</u> – гэта словы **аднакарэнныя** ці неаднакарэнныя?

50. Вежа – гэта замак ці **башня**?

51. Гай і бор – гэтыя словы сінонімамі з’яўляюцца ці **не з’яўляюцца**?

52. <u>Спрадвечны</u> і <u>старажытны</u> – антонімы ці **сінонімы?**

53. Азімыя сеюць **восенню** ці вясной?

54. Кім вам даводзіцца свёкар вашай мамы – **дзедам** ці дзядзькам?

55. Якая прыстаўка – паказчык таго, што чалавек ужо не займае пэўную пасаду: **экс-** ці віцэ- ?

56. Як называецца асноўная грашовая адзінка Індыі – тугрык ці **рупія**?

57. Які палац знаходзіцца ў Лондане – Версальскі ці **Букінгемскі**?

58. Аўстралія – востраў ці **мацярык**?

59. У якой краіне нарадзіўся А. Македонскі – у Грэцыі ці ў **Македоніі**?

60. У якой краіне пачынае свой шлях алімпійскі агонь – у **Грэцыі** ці Францыі ?

61. Разнавіднасць якой расліны называюць даўгунец – **ільну** ці бавоўны?

62. Гэтае слова, запазычанае з англійскай мовы, азначае "трэнер-інструктар": **коўч** ці клон?

63. Якая мова афіцыйная ў Аўстраліі – аўстралійская ці **англійская**?

64. Якой краіне належыць Пізанская вежа – Партугаліі ці **Італіі**?

65. Які метал не тоне ў вадзе – **калій** ці магній?

66. Для барацьбы з чым прымяняюць рэагенты – з дажджом ці з **ільдом**?

67. Хто з герояў Шэкспіра больш малады – Гамлет ці **Рамэо**?

68.Якая з гэтых назваў перакладаецца як "шмат астравоў"– **Палінезія** ці Самоа?

69. Куды раяць апусціць брыльянт, каб устанавіць яго сапраўднасць – **у чыстую ваду** ці ў малако?

70. Зубное мыла ёсць ці **няма**?

71. Які газ ў атмасферы Зямлі абараняе жывыя арганізмы ад дрэннага выпраменьвання – азот ці **азон**?

72. Што на нагах у чалавека, які выконвае скачок <u>сальхаў</u> – **канькі** ці пуанты?

73. Якога пакарання няма ў хакеістаў – малога штрафа ці **пазбаўлення клюшкі**?

74. З якім прыстасаваннем не ловяць рыбу – з **бумерангам** ці астрогай?

75. Які музычны інструмент – неафіцыйны сімвал Шатландыі: гітара ці **валынка**?

76. Мурэна – гэта **рыба** ці птушка?

77. У якія супольнасці аб'ядноўваюцца як пінгвіны, так і бактэрыі – **калоніі** ці дыяспары?

78. Больш педалей у матацыкла ці ў **тандэма**?

79. Якую частку ўсяго жыцця займаюць панядзелкі: **1/7** ці 1/10?

80. Якога пісьменніка звалі Фёдар Міхайлавіч – **Дастаеўскага** ці Булгакава?

81. Якая малпа самая вялікая – **гарыла** ці арангутанг?

82. З якой жывёлай звязана дзейнасць кінолага – з **сабакам** ці з канём?

83. Колькі чалавек старалася выцягнуць рэпку ў казцы – чатыры ці **тры**?

84. Мацарэла – гэта каўбаса ці **сыр**?

85. Хто карыстаецца медыятарам – **гітарыст** ці скрыпач?

86. Якой мове навучыў Пятніцу Рабінзон Круза – французскай ці **англійскай**?

87. Да чаго схільны клептаман – да шантажу ці да **краж**?

88. Дзе нашываюцца эпалеты – на ботах ці на **верхняй частцы мундзіра**?

89. Хто не выкарыстоўвае ў сваёй дзейнасці паняцце “нота”– дыпламат ці **скульптар**?

90. У якой п’есе А. Чэхава няма доктара – “Чайка” ці “**Вішнёвы сад**”?

91. Колькі колаў у матацыкла з каляскай – **тры** ці чатыры?

92. У якой краіне прыдумалі гульню “Хто хоча стаць мііянерам” – у ЗША ці ў **Вялікабрытаніі**?

93. У якой вобласці Расіі прызямліўся пасля касмічнага палёта Юрый Гагарын – у Самарскай ці ў **Саратаўскай**?

94. Як жартоўна называюць нявопытнага аўтавадзіцеля – **чайнік** ці тазік?

95. Курган Славы далёка ад сталіцы Беларусі ці **недалёка**?

96. Праграмны верш П.Панчанкі “Сармацкае кадзіла” напісаны на тэму патрыятычную ці **экалагічную**?

97. Песню “Куточак Беларусі” у вядомым відэакліпе выконвае **Алёна Ланская** ці Юлія Быкава?

98. Чым мераюцца паміж сабой у армрэслінгу – памерам жыватоў ці **сілай рук**?

99. Колькі ножак у класічнага раяля – дзве ці **тры**?

100. Жартоўнае пытанне: можа ці **не можа** страус называць сябе птушкай? (у адказе – **не валодае мовай**).